Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкавіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – сярэдняя школа”

# Памятнае месца аграгарадка
(канспект  гутаркі)

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна
вышэйшая адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

Мэта: фарміраванне патрыятычнай свядомасці ў дашкольнікаў, пачуццё падзякі і гонару за вялікі подзвіг нашага народа, разумення ўрачыстасці значэння “хвіліна маўчання”.

Папярэдняя праца: гутаркі з дзецьмі аб Вялікай Айчыннай вайне, заняткі па выяўленчай дзейнасці, чытанне мастацкай літаратуры, сузіранне ілюстрацый, праслухоўванне музыкі ваенных гадоў.

Ход гутаркі

Даўно адгрымелі залпы Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, але як напамін аб тых крывавых падзеях стаяць па ўсёй зямлі помнікі. У кожным горадзе і ў кожным сяле то манумент, то сціплы абеліск, нагадваючы цяперашняму пакаленню, што дзеля жыцця на зямлі, дзеля дзяцей і ўнукаў мільёны савецкіх людзей аддалі свае жыцці. У нас у вёсцы таксама ёсць такое месца – Помнік загінулым воінам-аднавяскоўцам, які размешчаны ў цэнтры вёскі, у прыгожым парку. Там нельга крычаць, бегаць, ірваць кветкі, а трэба паводзіць сябе спакойна. Гэта такое месца, дзе людзі хвілінай маўчання дзякуюць загінуўшым героям і шануюць іх памяць. (Паказ віртуальнай экскурсіі)

Дзеці, як называецца месца, навошта быў створаны гэты помнік? (адказы дзяцей)

Правільна, гэта месца памяці загінулых салдат нашай мясцовасці. У памяць аб тых воінах - героях, якія загінулі пры вызваленні нашай Радзімы.

Дзеткі, паглядзіце колькі тут дрэў, яны не проста так тут растуць. Яны з'яўляюцца сімвалам, як быццам маці і сёстры схіліліся над братамі і сынамі, якія не вярнуліся з вайны Усе святы ў вёсцы пачынаюцца з наведвання помніка. Асабліва шмат тут людзей у Дзень Перамогі – 9 мая.

Усе людзі зямлі змагаюцца за мір, каб страшная вайна больш не паўтарылася. У людзей ёсць традыцыя – шанаваць памяць герояў хвілінай маўчання.

Рабяты, сёння мы з вамі наведалі помнік воінам-пераможцам Вялікай Айчыннай вайны.